Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 235 (304)
ЧАЦВЕР
10
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

АБ КУЛЬТУРНЫМ ГАРЫЗОНЦЕ ПАРТЫЙНЫХ КАДРАЎ

XVIII з'езд ВКП(б) высунуў на першы план пытанне комуністычнага выхавання мас. Барацьба з перажыткамі капіталізма ў сазнанні працоўных, павышэнне іх комуністычнай свядомасці — вось адна з галоўных задач нашага часу. Гэта прад'яўляе велізарныя патрабаванні перш за ўсё к партыйным кадрам, к актыўным дзеячам вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Усё большую ролю набываюць у нас цяпер пытанні культуры. Развіццё СССР ярка падцвярджае марксісцкі тэзіс аб тым, што грамадскае быцце вызначае грамадскае сазнанне, — таржаству соцыялістычных адносін вытворчасці ў СССР адпавядае і магутны росквіт соцыялістычнай культуры. Нябачаны ў капіталістычных краінах размах набыла народная асвета ў СССР. Магутна развіваецца совецкая навука, на патрэбы якой не шкадуе сродкаў совецкая дзяржава. Віднае месца ў жыцці совецкага народа занялі і такія галіны культурнай дзейнасці, як літаратура і мастацтва.

Уся культурная работа павінна быць накіравана ў адно русла. Усе галіны духоўнага жыцця — навука, мастацтва, школа і ВНУ, друк, — павінны, пад кіраўніцтвам партыі, служыць благароднай справе будаўніцтва комунізма.

Большэвікі — адзіныя законныя наследнікі ўсіх багаццяў культуры, якія на працягу вякоў выпрацавала чалавецтва. Соцыялістычнае грамадства прыняла ў свае рукі культурную спадчыну мінулага і, абагачаючы яго, нясе ўперад. У той час, як у капіталістычных краінах разбураюцца найвялікшыя скарбніцы культуры, совецкія людзі пільна аберагаюць культурныя багацці, накопленыя чалавецтвам.

Партыя Леніна—Сталіна вучыць сваіх членаў, вучыць увесь совецкі народ таму, як беражна трэба адносіцца да гэтай спадчыны, заклікае глыбока вывучаць яе, авалодваць ёю, бо без гэтага не можа быць соцыялістычнай культуры.

Адсюль ясна, якое выключнае значэнне набывае работа партыйнага актыва над павышэннем свайго культурнага ўзроўню. Таварыш Сталін гаварыў на XVIII з'ездзе ВКП(б), што нашай задачай з'яўляецца зрабіць усіх рабочых і сялян адукаванымі. У першую чаргу гэта задача павінна быць вырашана ў адносінах партыйных кадраў. Партыя ажыццяўляе кіраўніцтва ўсімі сторанамі развіваючайся ў СССР соцыялістычнай культуры, таму і самі партыйныя кадры павінны быць глыбока культурнымі.

— Вы чалавек партыйны і павінны цікавіцца ўсім, — такую рэпліку падаў таварыш Сталін на першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў парторгу шахты «Цэнтральная-Ірміна» тав. Петрову.

Партыя ўдзяляе выключную ўвагу павышэнню ідэйнага ўзроўню сваіх кадраў. Задача авалодання большэвізмам, усваення законаў грамадскага развіцця, авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй стаіць перад усімі нашымі кадрамі: партыйнымі, профсаюзнымі, совецкімі, гаспадарчымі.

«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)»— гэта энцыклапедыя марксізма-ленінізма — даў магутны штуршок да павышэння тэарэтычнага ўзроўню нашых работнікаў. Па ўсёй краіне расце і шырыцца імкненне ўсіх атрадаў нашай інтэлігенцыі да авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй. Тут дасягнуты ўжо значныя поспехі, асабліва партыйнымі кадрамі. Але поўнае рашэнне гэтай задачы ўпіраецца ў значнай меры ў неабходнасць расшырэння культурнага гарызонту нашых кадраў. Бо недастаткова вывучыць толькі «Кароткі курс». Усваенне яго глыбокага зместу павінна прабудзіць густ к авалоданню марксісцка-ленінскай тэорыяй, павінна стаць штуршком к рабоце над тварэннямі класікаў марксізма-ленінізма, над асноўнымі працамі Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна.

У сваёй гістарычнай прамове аб задачах саюза моладзі Ленін паказаў няправільнасць думкі, быццам зучыцца комунізму — гэта значыць толькі завучыць комуністычныя лозунгі, толькі завучыць гатовыя комуністычныя вывады. Як указвае Ленін, гэта прывяло-б да стварэння комуністычных начотчыкаў ці хвастуноў і скрозь і ўсюды прыносіла-б нам вялікія шкоды і страты. Нельга стаць комуністам, паказаў у сваёй выдатнай прамове Ленін, не ўсвоіўшы таго, што накоплена чалавечымі ведамі.

Вучэнне Маркса, пісаў Ленін, «узнікла як прамы і непасрэдны працяг вучэння найвялікшых прадстаўнікоў філасофіі, палітычнай эканоміі і соцыялізма... Яно ёсць законны пераемнік лепшага, што стварыла чалавецтва...»

Вось чаму Ленін так настойліва растлумачвае думку, што нельга стаць сапраўдным комуністам, не ўсвоіўшы ўсёй сумы ведаў, выпрацаваных чалавецтвам. Леніну належыць палажэнне: «Комуністам стаць можна толькі тады, калі ўзбагаціш сваю памяць веданнем усіх тых багаццяў, якія выпрацавала чалавецтва».

З агульным уздымам культурнага ўзроўню ў нашай краіне, з павышэннем марксісцка-ленінскай свядомасці нашых кадраў, па меры поспехаў у справе вывучэння «Кароткага курса» нашымі кадрамі і іх работы над творамі класікаў марксізма-ленінізма, усё большае значэнне набывае задача расшырэння культурнага гарызонту комуніста.

Ствараючы рэволюцыйны светапогляд пролетарыята, Маркс абапіраўся на нямецкую філасофію, на англійскую палітычную эканомію, на французскі соцыялізм. Ясна таму, што нельга глыбока ўсвоіць марксізм-ленінізм без вывучэння палітычнай эканоміі, філасофіі, гісторыі грамадскай думкі. І нельга атрымаць трывалыя эканамічныя і філасофскія веды без знаёмства з асноўнымі вывадамі прыродазнаўства, з важнейшымі фактамі гістарычнай навукі.

Усё новыя і больш складаныя задачы высоўвае перад партыйнымі кіраўнікамі, арганізатарамі вялікага будаўніцтва комунізма, наша соцыялістычная рэчаіснасць.

Партыя Леніна—Сталіна кіруе ўсёй дзяржаўнай дзейнасцю ў нашай краіне, у тым ліку велізарнай, аснашчонай багацейшай тэхнікай соцыялістычнай гаспадаркай. Партыйныя кадры абавязаны авалодаць эканамічнымі навукамі, эканамічнай тэорыяй марксізма-ленінізма. Гэта дасць ім магчымасць лепш кіраваць прамысловасцю, транспартам, сельскай гаспадаркай. Эканамічная адукацыя партыйных кадраў — абавязковая ўмова нашага пабеданоснага руху ўперад.

Неабходна ведаць і мастацкую літаратуру, і творы мастацтва. І тут трэба вучыцца ў класікаў марксізма-ленінізма, у якіх найшырэйшыя навуковыя веды спалучаюцца з глыбокім разуменнем усіх старон чалавечай культуры.

Мастацтва і літаратура будуць паспяхова служыць справе соцыялізма толькі пры ўмове належнага партыйнага кіраўніцтва. Стала быць, ад нашых партыйных кадраў патрабуецца авалоданне і гэтай старанай «духоўнай вытворчасці», як выражаўся Маркс.

Задача сістэматычнага павышэння культурнага ўзроўню нашых кадраў—справа цяжкая, але цалкам вырашымая. Трэба толькі праявіць настойлівасць і ўпорства ў дасягненні пастаўленай мэты. Нельга адгаварвацца тым, што ў работнікаў не хопіць часу для расшырэння свайго культурнага кругазору, для ўзбагачэння свайго розуму скарбамі чалавечай культуры. Неабходна ўспомніць, як у стары час, пры царызме, перадавыя рабочыя, прыходзіўшыя ў нашу партыю, знаходзілі час авалодваць культурай, манапалізіраванай у той час пануючым класам. Перадавыя рабочыя вывучалі і «Капітал» Маркса, і творы Леніна. Яны знаёміліся і з Дарвінам. Яны вывучалі класічную літаратуру, гісторыю, філасофію. Так, праз усе перашкоды старэйшае пакаленне большэвікоў прабівала сабе дарогу да вышынь чалавечай культуры.

У цяперашні час у краіне соцыялізма створаны ўсе ўмовы для таго, каб нашы кадры маглі паспяхова авалодваць вышынямі культуры. Большэвікі не пасуюць перад цяжкасцямі. Яны прывыклі іх перамагаць. Яны сумеюць справіцца і з задачай далейшага павышэння свайго ідэйнага ўзроўню, расшырэння свайго культурнага гарызонту.

І калі нашы кадры даб'юцца поспехаў у гэтай справе, яны змогуць больш эфектыўна кіраваць навуковымі ўстановамі, літаратурай, мастацтвам, школай, накіроўваючы ўсе стораны нашага жыцця ў адно русла, русла барацьбы за пабудову комуністычнага грамадства.

Між тым да гэтага часу далёка не адзінічныя факты, калі некаторыя партыйныя кіраўнікі выяўляюць не толькі абураючае невуцтва ў галіне марксісцка-ленінскай тэорыі, але і поўную непісьменнасць у пытаннях культуры. Такія кіраўнікі звычайна дрэнна спраўляюцца і з практычнай справай, якую ім даручыла партыя. Яны робяць памылку за памылкай, яны губляюць аўтарытэт, адстаюць ад радавых членаў арганізацыі.

Але ёсць і іншыя кіраўнікі, якія, не гледзячы на сваю загружанасць практычнай работай, знаходзяць час для абагачэння свайго розуму, для расшырэння сваіх ведаў. У такіх арганізатараў ідзе значна лепш і практычная справа. Па такіх людзях павінны раўняцца ўсе нашы партыйныя кадры. Авалодваючы вышынямі культуры, яны магутна рушаць уперад справу ўздыму комуністычнай свядомасці ў нашай краіне, справу комуністычнага выхавання працоўных мас.

(Перадавы артыкул «Праўды» за 8 кастрычніка).

ДАДЗІМ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ КРАІНЕ МАГУТНЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ РЭЗЕРВЫ

ВАЖНАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА

Хвалю новага вытворчага ўздыму і энтузіязма сярод рабочых прадпрыемстваў Гродна выклікаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах.

З пачуццём гордасці і радасці выказалі сваю ўдзячнасць і адабрэнне чыгуначнікі. Дзяжурны па станцыі тав. Карэйва гаворыць:

— Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета — гэта вялікае дзяржаўнае мерапрыемства. Ён дае магчымасць кожнаму юнаку атрымаць кваліфікацыю, стаць поўнацэнным рабочым на нашых соцыялістычных прадпрыемствах.

Словы, поўныя любві і ўдзячнасці совецкай уладзе, выказаў комсамолец тав. Пахута.

— Радуюся, — сказаў тав. Пахута, — за сваіх таварышоў, якім выпала вялікая чэсць быць прызванымі першымі ў школы і вучылішчы.


З вялікай радасцю віталі Указ аб дзяржаўных працоўных рэзервах рабочыя сталярна-механічных майстэрань. Стаханаўцы тт. Механік, Шмытун, Галубовіч, Жадкоўскі і Залешынскі расказвалі аб цяжкасцях, якія ім прышлося перажыць, каб атрымаць кваліфікацыю.

— Дзякую табе, радзіма, за клопаты аб дзецях! — гаворыць стары рабочы Галубовіч. — Мае чацвёра дзяцей цяпер будуць вучыцца вытворчай кваліфікацыі. З радасцю я пашлю іх у рамесленыя школы.

Вітаючы гэта выключна важнае дзяржаўнае мерапрыемства, калектыў сталярна-механічных майстэрань узяў на сябе абавязацельства гадовы план выканаць на 100 процантаў да XXIII гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

На ўсіх прадпрыемствах Гродна шырока разгорнута масава-растлумачальная работа. На чыгунцы, на веласіпедным заводзе агітатары праводзяць гутаркі, растлумачваюць працоўным гістарычнае значэнне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і пастанову Соўнаркома аб прызыве гарадской і калгаснай моладзі ў ствараемыя школы і вучылішчы.

П. Самуйлаў.



На здымку: ткач-двухстаночнік 17 беластоцкай тэкстыльнай фабрыкі М. Мяльніцкі. Вытворчае заданне тав. Мяльніцкі выконвае на 115 процантаў.

Фота А. Сапіра.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ АТРЫМАЕ КВАЛІФІКАВАНУЮ РАБОЧУЮ СІЛУ


Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб стварэнні дзяржаўных працоўных рэзерваў дасць магчымасць нашай прамысловасці ў арганізаваным парадку атрымоўваць кваліфікаваную рабочую сілу. Моладзь 14 і 17 год, якая будзе вучыцца ў школах фабрычна-заводскага навучання, будзе забяспечана ўсім.

Выданы Указ дапаможа працоўным асвайваць разнастайныя спецыяльнасці, ліквідаваць «сямейнасць», якаяназіралася на шкляных заводах. Тут, напрыклад, было заведзена так, што ў майстры не дапускаліся «чужакі», а гэта работа перадавалася толькі па спадчыне. Так майстэрства шклодува пераходзіла ад прадзеда да праўнука і т. д.

Шкляныя заводы, якія асталіся ад польскіх капіталістаў, не мелі ніякага механічнага абсталявання і мінімальных умоў па тэхніцы бяспаснасці. Цяпер гэтыя заводы набываюць новы выгляд. У прыватнасці, па беластоцкаму шкляному заводу намячаецца ўвесці механічнае абсталяванне для выпрацоўкі бутэлек, а таксама для апрацоўкі сырых матэрыялаў, якія да гэтага часу апрацоўваліся ўручную.

І. Элькінд,
галоўны інжынер беластоцкага шклянога завода.

Па Совецкай краіне



Добры ўраджай яблыкаў збірае ў гэтым годзе соўгас «Брылёва», Гомельскага раёна БССР. На здымку: работніца Ж. Я. Жураўская здымае яблыкі.

Фота К. Якубовіча.

Фотахроніка БЕЛТА.

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ БУДЫНКА ТЭАТРА САТЫРЫ

У Маскве на вуглу пляцоўкі Паўстання і Барыкаднай вуліцы пачаўся знос старых дамоў. Тут адведзен вялікі ўчастак для новага будынка тэатра Сатыры, які будзе збудаван па праекту архітэктараў Д. Чэчуліна і К. Орлова. Глядзельны зал тэатра разлічан на 1.200 чалавек.

Акрамя асноўнага будынка, тутжа будзе пабудаван корпус для падсобных памяшканняў тэатра. У ім размесцяцца дэкаратыўныя майстэрні, гараж і т. д.

РАТАВАЛЬНІКІ ЭКСПЕДЫЦЫІ ПАДВОДНЫХ РАБОТ АСОБАГА НАЗНАЧЭННЯ

ЛЕНІНГРАД. Ля сценкі суднабудаўнічага завода імені Марці заканчваюцца падрыхтаванні да хадавых выпрабаванняў двух новых ратавальнікаў — караблёў «Нептун» і «Сатурн», пабудаваных па заказу Галоўнага ўпраўлення экспедыцыі падводных работ асобага назначэння (ЭПРОН).

Гэта буйнейшыя ратавальнікі акіянскага тыпу, разлічаныя на аварыйныя і суднапад'ёмныя работы пры любым становішчы мора. Выпуск такіх караблёў — буйнейшая перамога ленінградскіх суднабудаўнікоў. «Нептун» і «Сатурн» забяспечаны дасканалымі суднапад'ёмнымі і водаадліўнымі сродкамі, кампрэсарнымі і прамыўнымі ўстаноўкамі.

У складзе каманды ратавальніка 70 чалавек. Бытавыя памяшканні караблёў адзелаты з вялікім камфортам.

У бліжэйшы час «Нептун» і «Сатурн» выйдуць у мора.

РАСТУЦЬ РАДЫ ЭСТОНСКІХ ПРОФСАЮЗАЎ

ТАРТУ (Эстонская ССР). З кожным днём растуць рады профсаюзаў Эстоніі. Тры з паловай месяцы назад у Тарту налічвалася 1.400—1.500 членаў профсаюза, зараз іх — 17 тысяч. Профсаюз будаўнічых рабочых вырас у 13 разоў, рабочых скуранной прамысловасці—у 4,5. У профсаюзе металістаў, які налічваў некалькі дзесяткаў членаў, цяпер састаіць 1100 чалавек. Створаны новыя профсаюзы — работнікаў асветы, аховы здароўя і гандлёвых служачых.

На ўсіх прадпрыемствах Тарту закончаны выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў. Зараз фабзаўкомы шырока разгортваюць перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва. Па ініцыятыве профсаюзаў на фабрыках і заводах горада рэгулярна праводзяцца лекцыі і даклады на грамадска-палітычныя тэмы.

ВЫЯЎЛЕНЫ СЦЕНЫ МАНАМАХАВА САБОРА

СМАЛЕНСК. У час падземных работ у Смаленску выяўлены рэшткі сцен Манамахава сабора, які мае выдатную гісторыю, У 1611 годзе пасля 20-месячнай асады Смаленска, горад у выніку здрады быў заняты інтэрвентамі. Тады тры тысячы доблесных абаронцаў горада, сабраўшыся ў Манамахавым саборы, рашылі лепш памерці, чым здацца ў палон. Яны загінулі, узарваўшы порах, які захоўваўся ў паграбах пад саборам.

Ля рэшткаў сцен сабора выяўлены прадметы ўзбраення, якія адносяцца к часу гераічнай абароны Смаленска. Раён, дзе, па меркаванню вучоных, быў сабор, аб'яўлен горсоветам запаведнікам. Тут намячаецца правесці археалагічныя раскопкі.



Наталля Сек, прыехаўшая на Урал з заходніх абласцей Беларусі, працуе на будаўніцтве ніжне-тагільскага вадаправода (Свярдлоўская вобласць), добра авалодала адбойным малаткем і выконвае месячнае заданне на 130 процантаў.

Фота Н. Мезенцава.

Фота-клішэ ТАСС.

БУДАЎНІЦТВА НОВАГА КАНАЛА

АЛМА-АТА. У Кзыл - Ордынскай вобласці пачалося будаўніцтва вялікага Нова-Чыілінскага канала. На трасу канала вышла 15.800 калгаснікаў.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

ДЗЕЯННІ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 9 кастрычніка. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што асноўныя аперацыі англійскіх ваенна-паветраных сіл, прадпрынятыя ў ноч на 9 кастрычніка, былі сканцэнтрыраваны супроць германскіх ваенна-марскіх баз у Брэмене і Вільгельмсгафене. Абодвум аб'ектам прычынены цяжкія пашкоджанні; адбыліся ўзрывы і ўспыхнулі пажары.

Злучэнні англійскай авіяцыі зрабілі новыя напады на ваенныя аб'екты праціўніка ў Заходняй Германіі. Больш 16 тон бомб было скінута на ваенна-марскую базу ў Вільгельмсгафене, Галандыі і акупіраванай часткі Францыі. Бамбардыроўцы напалі таксама нафтаачышчальныя заводы ў Гамбургу і Гельзенкірхене, сілавая станцыя ў Кілі, заводы Крупа ў Эсене, металургічныя прадпрыемствы ў Ганау, авіязаводы «Фокер» у Амстэрдаме, таварныя склады ў Мангейме і некалькі непрыяцельскіх аэрадромаў.

Усе англійскія самалёты шчасліва звярнуліся на свае базы.

XIV З'ЕЗД ЛКСМБ

Масква, Крэмль.

Таварышу СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Вам, вялікаму правадыру і лепшаму другу савецкай моладзі, шлем мы, дэлегаты XIV з'езда Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі, ад імені 263 тысяч комсамольцаў і ўсёй моладзі рэспублікі наша палкае, сардэчнае, комсамольскае прывітанне.

Ленінска-Сталінскі комсамол Беларусі прышоў да свайго XIV з'езда манаалітным атрадам, цесна згуртаваным вакол сваёй мацеры — большэвіцкай партыі, да канца адданым вялікай справе Леніна—Сталіна.

XVIII з'езд партыі большэвікоў прадаставіў комсамолу права прымаць самы актыўны ўдзел у рашэнні задач гаспадарчага і дзяржаўнага будаўніцтва. Комсамольцы Беларусі гатовы аддаць усе свае сілы на тое, каб апраўдаць вялікае давер'е партыі.

Велізарныя і разнастайныя поспехі нашай квітнеючай радзімы на ўсіх участках соцыялістычнай будоўлі. Вялікі і шматгранны ўдзел савецкай моладзі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Комсамол і савецкая моладзь сваімі поспехамі абавязаны партыі, абавязаны Вам, родны Іосіф Вісарыёнавіч, Вашым штодзённым бацькоўскім клопатам, якія Вы праяўляеце штодзённа, штогадзінна аб моладзі.

Гэта Вы разам з геніем чалавецтва Уладзімірам Ільічом Леніным стварылі, выхавалі і загартавалі ў барацьбе комсамол — перадавы атрад савецкай моладзі. Вы забяспечылі нам цудоўнае, шчаслівае, радаснае, квітнеючае жыццё. Вы адкрылі перад савецкай моладдзю шырокія шляхі да вяршынь чалавечага шчасця, да працы, да творчасці, да геройкі. Ваша імя заўсёды і ўсюды натхняла і натхняе працоўных на нябачаныя ў свеце творчыя дзярзанні, на гераічныя подзвігі ў славу нашай квітнеючай радзімы. Ваша імя, Іосіф Вісарыёнавіч, — гэта наш баявы сцяг, сцяг барацьбы і перамог.

Самааддананай працай, жалезнай сталінскай дысцыплінай, нястомным узмацненнем ваеннай магутнасці краіны, выдатнай вучобай адказвае мнагамільённая савецкая моладзь на Вашы бацькоўскія клопаты.

Мы запэўняем Вас, Іосіф Вісарыёнавіч, што, свята і чэсна захоўваючы заветы вялікага Леніна, няўхільна следуючы Вашым мудрым указанням і парадам, комсамол Беларусі, уся моладзь рэспублікі будзе і ў далейшым самааддана і мужна змагацца за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б), за канчатковую перамогу справы Леніна—Сталіна, за поўную пабудову камунізма ў нашай краіне.

Сіла і крыніца моцнасці Ленінска-Сталінскага комсамола — у штодзённым кіраўніцтве слаўнай і непераможнай Усесаюзнай Комуністычнай партыі большэвікоў. Мы запэўняем большэвіцкую партыю, запэўняем Вас, таварыш Сталін, што заўсёды і ўсюды, на любых участках соцыялістычнага будаўніцтва будзем вернымі памочнікамі партыі, аддадзім усе свае сілы, усе свае веды на ўмацаванне і абарону сваёй радзімы.

Ленінска-Сталінскі комсамол быў, ёсць і будзе баявым рэзервам і верным памочнікам партыі ў барацьбе за пабудову комунізма ў нашай краіне.

Няхай жыве вялікая партыя Леніна-Сталіна—арганізатар і кіраўнік пабеданоснага будаўніцтва комунізма ў нашай краіне!

Няхай жыве Ленінска-Сталінскі комсамол — верны памочнік і баявы рэзерв большэвіцкай партыі!

Няхай жыве і здраўствуе доўгія, доўгія годы наш лепшы друг і настаўнік, правадыр працоўных усяго свету, наш родны і любімы Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Масква, Крэмль.

Таварышу МОЛАТАВУ

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Вам, главе першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы, бліжэйшаму саратніку вялікага Сталіна, XIV з'езд Ленінскага комсамола Беларусі шле сваё палкае комсамольскае прывітанне.

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч! Вашай энергіі, нястомнай дзейнасці на пасту главы савецкага ўрада наша краіна ў многім абавязана сваімі поспехамі і перамогамі.

Дзякуючы мудрай сталінскай палітыцы міру савецкага ўрада, узначальваемага Вамі, Вячэслаў Міхайлавіч, узрос міжнародны аўтарытэт Савецкага Саюза, і наша краіна ўпэўнена прадаўжае сваю мірную творчую працу.

Сталінская палітыка міру дала магчымасць беларускаму народу ажыццявіць сваю векавую мару аб з'яднанні ў адзінай соцыялістычнай дзяржаве. Натхнёны Вашым заклікам, з іменем вялікага Сталіна на вуснах, доблесныя воіны краіны соцыялізма зрабілі свой вызваленчы паход і прынеслі свабоду і шчасце 13 мільёнам працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

XIV з'езд ЛКСМБ запэўняе Вас, Вячэслаў Міхайлавіч, што Комсамол Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б будзе і ў далейшым нястомна працаваць на карысць сваёй любімай соцыялістычнай айчыны, выхоўваць усю моладзь рэспублікі ў духу адданасці справе большэвіцкай партыі, у духу дысцыплінаванасці і арганізаванасці, любві да працы на карысць соцыялістычнай радзімы.

Запэўняем Вас, дарагі Вячэслаў Міхайлавіч, што будзем і ў далейшым, не пакладаючы рук, працаваць над тым, каб мацнела магутнасць нашай радзімы, каб яшчэ больш магутнейшай была наша доблесная Чырвоная Армія, будзем нястомна працаваць над тым, каб даць краіне больш самалётаў, танкаў, гармат, стварыць невычарпальныя працоўныя рэзервы.

Няхай жыве савецкі ўрад і яго глава, верны вучань і бліжэйшы саратнік вялікага Сталіна — Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве наш любімы правадыр, друг і настаўнік — вялікі і мудры Сталін!



Ткачыха Аршанскага ільнокамбіната (Віцебская вобласць), дэлегат XIV з'езда комсамола Беларусі М. Г. Глушанкова. Стаўшы 3-га кастрычніка на стаханаўскую вахту імені з'езда, яна з 12 станкоў перайшла на абслугоўванне 16 і выпрацавала 1.467,5 пагонных метра тканіны.

Фота М. Савіна. Фотахроніка БЕЛТА.

Прамова тав. Маўрына—

сакратара Беластоцкага абкома комсамола — на XIV з'ездзе ЛКСМБ

Беластоцкая абласная комсамольская арганізацыя ўпершыню ўдзельнічае на з'ездзе комсамола. За кароткі тэрмін свайго існавання комсамольскія арганізацыі нашай вобласці значна ўзмацніліся, павялічылі свае рады.

Выконваючы рашэнні XVIII з'езда ВКП(б), комсамол праявіў сябе на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва баявым памочнікам партыі Леніна—Сталіна. Пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйных арганізацый комсамольскія арганізацыі правялі велізарную работу па нацыяналізацыі прамысловасці, банкаў, правядзенню выбараў у Народнае Сабранне, Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

У Беластоку, Гродне, Ваўкавыску і іншых раёнах 637 чалавек з лясовай моладзі працавалі агітатарамі, 18 чалавек—старшынямі акруговых выбарчых камісій, 167 юнакоў і дзяўчат працавалі старшынямі ўчастковых камісій.

Велізарны ўздым сярод моладзі праяўляецца ў росце прадукцыйнасці працы. Сіламі комсамольцаў і моладзі ў Гродненскім раёне, напрыклад, пабудавана 11-кіламетравая дарога на працягу 15—20 дзён, а былая польская дзяржава праектыравала будаваць гэтую дарогу 7—8 год. Пабудавана таксама шасейная дарога ў Свіслацкім раёне.

Комсамольцы з'яўляюцца ініцыятарамі соцыялістычнага спаборніцтва. Застрэльшчыкамі ў гэтай вялікай справе выступілі тэкстыльшчыкі горада Беластока.

Пры правядзенні першай большэвіцкай сяўбы на вызваленай зямлі, у час уборкі ўраджаю і загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў комсамольцы і моладзь таксама паказалі ўзоры ў рабоце. Комсамольская арганізацыя калгаса «КІМ», Свіслацкага раёна, арганізавала 6 комсамольска-маладзёжных звенняў па ўборцы ўраджаю. Звенні працавалі па-стаханаўску.

За кароткі час абласной комсамольскай арганізацыяй вылучана на кіруючую комсамольскую, савецкую і гаспадарчую работу 718 найбольш здольных работнікаў. Напрыклад, комсамолец тав. Мяркулаў вылучан на пасаду старшыні Сакольскага райвыканкома. Навапрынятыя ў рады ленінскага комсамола тт. Лашак і Юхневіч удастоены вялікай чэсці—яны выбраны дэпутатамі Вярхоўнага Совета БССР.

У парадку выканання рашэнняў XI пленума ЦК ВЛКСМ аб рабоце з актывам і перабудове комсамольскага апарата на нашай вобласці створаны 104 пастаянных камісіі, у якіх працуе каля 830 чалавек, у тым ліку 243 дзяўчыны. Камісіі прыцягнулі да работы шырокі актыў і працуюць лепш, чым раней існаваўшыя аддзелы.

Беластоцкая вобласць з'яўляецца пагранічнай. Гэта абавязвае нас усё вышэй і вышэй узнімаць большэвіцкую пільнасць.

Перад абласной комсамольскай арганізацыяй стаяць вялікія задачы. Паручай таму, што з гэтымі задачамі мы справімся, з'яўляецца кіраўніцтва нашай слаўнай усёперамагаючай большэвіцкай партыі, аддасць комсамольскай арганізацыі настаўніку і правадыру вялікаму Сталіну. **(Апладысменты).**

Пленум ЦК ЛКСМБ

Адбыўся першы пленум ЦК ЛКСМБ XIV склікання. На пленуме выбрана бюро ЦК ЛКСМБ у колькасці 9 членаў. Членамі бюро выбраны тт. **Зімянін М. В., Ефройкін І. Л., Чэрнікава А. М., Мінькович М. А., Гарбушын К. П., Барашкаў М. П., Канстанцінаў Ф. Т., Мальчэўскі А. Н., Эпштэйн Г. Д.**

Першым сакратаром ЦК ЛКСМБ выбран тав. **Зімянін М. В.**, сакратаром па прапагандзе тав. **Ефройкін І. Л.**, сакратаром па школах тав. **Чэрнікава А. М.**, сакратаром па кадрах тав. **Мінькович М. А.**

Адказным рэдактарам газеты «Чырвоная змена» зацверджан тав. **Барашкаў М. П.**, адказным рэдактарам газеты «Сталінская моладзь» — тав. **Канстанцінаў Ф. Т.**

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Комуніст павінен быць добрым агітатарам

Партыйная арганізацыя 6-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната на сваім сходзе 7 кастрычніка абмеркавала пытанне аб становішчы агітацыйнай работы на камбінаце.

Сістэматычная агітацыйная работа на камбінаце пачалася з жніўня месяца. Агітколектыў спачатку складаўся з 12 агітатараў, зараз вырас да 17 чалавек. У цэхах з рабочымі праведзена 174 гутаркі на розныя тэмы. Галоўнымі пытаннямі, вакол якіх вялася агітацыйная работа, былі рашэнні VII Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня, міжнароднае становішча, і цяпер — Указ аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР.

Вылучаюцца ў агітацыйнай рабоце член партыі тав. Астралогава, галоўны інжынер камбіната тав. Кавалеўская, тт. Пшэбеляк, Пшэвальская, Карташоў, Крэйндзіна. Яны сур'ёзна рыхтуюцца да гутарак і сістэматычна праводзяць іх у цэхах з рабочымі.

У партарганізацыі вядзецца журнал уліку праведзеных гутарак. Запісваецца тэма гутаркі, хто праводзіў і колькі чалавек прысутнічала.

Тав. Пшэбеляк 24 верасня правёў гутарку аб соцыялістычнай дысцыпліне працы, 3 кастрычніка — аб міжнародным становішчы, 7 кастрычніка — аб Указе Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР. Прысутнічала 35-40 чалавек. Гутаркі тав. Пшэбеляк праводзіць для рабочых на іх роднай мове. Гутаркі праходзяць жыва і арганізавана.

У цэху сухой апрэтуры агітацыйную работу вядзе тав. Пшэвальская. У гэтым цэху працуюць жанчыны. Тав. Пшэвальская многа расказвае работніцам аб правах і абавязках жанчын Савецкага Саюза. Яе гутаркі ўважліва слухаюць работніцы.

Член партыі тав. Астралогава — агітатар ткацкага цэха. Ткачы 6-га камбіната — пісьменныя людзі і жыва цікавяцца ўсімі падзеямі. Працаваць сярод іх пачэсная задача. І тав. Астралогава гэта разумее. Яна глыбока і сур'ёзна рыхтуецца да гутарак. У выніку яе гутаркі карыстаюцца поспехам, праходзяць на высокім ідэйна-палітычным узроўні; ткачы задаюць многа пытанняў, на якія агітатар дае змястоўныя адказы.

Але не ўсе агітатары, у тым ліку і комуністы, па-большэвіцку адносяцца да вядзення палітычнай агітацыі сярод рабочых. Кіраўнік агітколектыва тав. Дзінабургская ўказала ў дакладзе, што комуністы-агітатары тт. Хаткоўскі, Гукаў, Арсеньеў і Быкоўская правялі ўсяго па пяцьшэсць гутарак з рабочымі. Намеснік дырэктара камбіната тав. Хаткоўскі спасылаецца на занятасць. Але сапраўдная прычына не ў гэтым. Тав. Хаткоўскі і іншыя недаацэньваюць значэнне палітычнай агітацыі, баяцца, што ім прыдзецца адказваць рабочым на даволі складаныя пытанні.

Правільна зрабіў партыйны сход, патрабаваўшы ад гэтых комуністаў неадкладна прыступіць да агітацыйнай работы ў цэхах. Комуніст павінен быць прыкладным агітатарам.

У выступленнях комуністы ўказалі, што аддзел прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома партыі не аказвае практычнай дапамогі агітколектыву. З гаркома ніхто ні разу не прысутнічаў на семінарах агітколектыва. Часта рабочыя задаюць агітатарам пытанні, якія датычацца работы мясцовых гандлёвых і комунальна-бытавых арганізацый, на якія без кансультацыі цяжка адказваць. Але кансультацыі па гэтых пытаннях атрымаць няма дзе. Неабходна, каб у парткабінеце гаркома быў кансультант па гэтых пытаннях.

Партыйны сход прыняў канкрэтнае рашэнне аб паляпшэнні палітычнай агітацыі на камбінаце.

П. Дудо.

Вучоба комуністаў у Граеве

Многія члены і кандыдаты партыі граеўскай раённай партарганізацыі закончылі вывучаць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» і прыступілі да вывучэння твораў Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна.

Член партыі тав. Барбікаў працуе над творам Леніна «Што такое «прыяцелі» народа і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў». Упартая праца над сабой дазволіла тав. Барбікаву стаць добрым прапагандыстам. Яго лекцыі і даклады карыстаюцца папулярнасцю сярод працоўных раёна.

Многа часу ўдзяляюць рабоце над сабой члены партыі тт. Маркоўскі, Старыковіч, Падольскі і Сіленкоў.

За апошні час у раёне прачытана 8 лекцый. Лекцыі наведалі амаль усе комуністы і многа інтэлігенцыі. Добра прайшлі лекцыі «Ленінска-сталінскае вучэнне аб соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі», «Аб Кастрычніцкай рэволюцыі 1917 года», «Аб савецкім патрыятызме». Цікавасць да лекцый вялікая.

Пры аддзеле прапаганды і агітацыі райкома партыі працуе 8 кансультантаў. Гэтыя таварышы праводзяць кансультацыі, у пярвічных партарганізацыях арганізоўваюць тэарэтычныя субяседванні.

Работнікі аддзела прапаганды і агітацыі сістэматычна ажыццяўляюць кантроль над вучобай комуністаў.

Між тым, у раёне ёсць асобныя комуністы, якія не пайшлі далей першага і другога раздзелаў «Кароткага курса».

Зусім не вучыцца член партыі тав. Семашка. Аднойчы у райкоме партыі ў яго запыталі, ці вывучае ён марксізм-ленінізм.

— А як-жа?—адказаў тав. Семашка.—Першы раздзел скора закончваю.

Мастацкай літаратуры ён не чытае, а газеты толькі праглядвае.

Як правіла, комуністы не вучацца ў тых пярвічных партыйных арганізацыях, дзе сакратары не паказваюць прыклада, як трэба працаваць над сабой.

В. Гарбанёў.

Комуністы і комсамольцы раз'ясняюць Указ

У Беластоцкай раённай канторы сувязі адбыўся чарговы адкрыты партыйны сход. Абмяркован даклад начальніка канторы тав. Жалезнякова аб правядзенні масава-растлумачальнай работы сярод рабочых і служачых у сувязі з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб працоўных рэзервах. У спрэчках выступілі тт. Жыліцкі, Цяленчанка, Германн і іншыя.

Комуністы і комсамольцы канторы прыступілі да растлумачэння Указа адразу пасля яго атрымання. Член партыі тав. Цяленчанка штодзённа праводзіць гутаркі з рабочымі і служачымі адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела. Такія-ж гутаркі і чыткі Указа правялі комсамольцы тт. Жыліцкі, Мазго, Міхайлава і іншыя.

Рабочыя і служачыя райканторы сувязі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб працоўных рэзервах сустрэлі з вялікім задаваленнем. Асабліва горача вітае Указ моладзь. З ліку моладзі каля 50 чалавек выказалі сваё жаданне паступіць у школы фабрычна-заводскага абучэння.



На лекцыі па гісторыі партыі ў марксісцка - ленінскім універсітэце выхаднога дня пры Барысаўскім гаркоме КП(б)Б. Злева — лектар Мінскага абкома КП(б)Б тав. Саламаха.

Фота І. Шышко. Фотахроніка БЕЛТА.

НАША РАДЗІМА

Карэла-Фінская ССР

31 сакавіка 1940 года на паўночным захадзе Савецкага Саюза ўзнікла новая саюзная рэспубліка, увахозячая ў брацкі саюз савецкіх рэспублік. Ідучы насустрач пажаданням працоўных Карэльскай Аўтаномнай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, шостая сесія Вярхоўнага Совета СССР рашыла далучыць да Карэльскай рэспублікі тэрыторыю, адышоўшую да СССР па мірнаму дагавору паміж СССР і Фінляндыяй. Сесія разам з тым пастанавіла пераўтварыць Карэльскую Аўтаномную рэспубліку ў саюзную Карэла-Фінскую Савецкую Соцыялістычную Рэспубліку.

Карэла-Фінскую ССР насяляюць два кроўных народы: карэлы і фіны,—а таксама рускія.

Тры чвэрці тэрыторыі рэспублікі пакрыты лесам, пераважна сасной і ёлкай. У рэспубліцы больш 20 тысяч азёр, у ліку якіх два найвялікшых возеры Еўропы: Ладажскае (звыш 18 тысяч квадратных кілометраў) і Онежскае (каля 10 тысяч квадратных кілометраў). На поўначы краіны і на значных узвышшах праспіраецца тундра—забалочаная, вечна мёрзлая зямля, якая адтайвае ў летнія месяцы на невялікую глыбіню.

Прырода краіны прадвызначыла яе гаспадарку. Бясрайнія лясы — крыніца невычарпальнай сыравіны для лясной прамысловасці. Цэлюлозна-папяровыя заводы, у ліку якіх такія вялікія, як Кандапожскі, Сегежскі, Кексгольмскі, Піткярантскі і іншыя, выпрацоўваюць цэлюлозу, паперу і картон усіх сартоў. Выдатная будаўнічая сасна карэла-фінскіх лясоў—лепшае дрэва для карабельных вежаў. Будаўнічы лес ідзе не толькі на патрэбы Савецкага Саюза, але і вывозіцца за граніцу.

Многа каштоўных пушных звяроў жыве ў таежных лясах краіны. Куніцы, расамахі, белкі, тхары, гарнастаі служаць прадметам промыслау. На поўначы жыве дзікі алень. Бурыя мядзведзі і велізарныя ласі бадзяюцца па глухіх гушчарах. На берагах лясных рэк водзіцца выдра. Паляванне—адно з асноўных заняткаў насельніцтва Карэла-Фінскай ССР.

Мноства багатых рыбай азёр і рэк і наяўнасць двух мораў, амываючых рэспубліку (Балтыйскае на паўднёвым захадзе і Белае на поўначы), робяць Карэла-Фінскую ССР адным з асноўных рыбных раёнаў Савецкага Саюза. Тут прамышляюць каштоўныя пароды рыбы: сёмгу, сіга, фарэль і інш. Быстра цякучыя рэкі з парогамі і вадаспадамі таяць у сабе велізарныя запасы энергіі. У гэтых рэках за годы савецкай улады пабудавана каля 20 новых электрастанцый.

Нетры краіны багаты выкапнямі. На дне азёр і ў горных пародах ёсць у вялікай колькасці жалезная руда. У Пудож-гары знойдзены велізарныя запасы руды (100 мільёнаў тон), якая мае каштоўны рэдкі метал—ванадый. На берагах Ладогі знойдзены залежы свінца, волава, асбесту. Ля Онежскага возера багатае месцанараджэнне шматэльнага каменнага вугалю, у залезе якога знаходзяцца такія каштоўныя прадукты, як вокіс алюмінія.

Балоты краіны маюць велізарныя запасы торфу (да 30 мільёнаў кубаметраў). К прамысловаму выкарыстанню ўсіх гэтых багаццяў прыступлена толькі ў апошнія годы.

Карэла-Фінская ССР славіцца на ўвесь свет сваімі каштоўнымі будаўніча-абліцовачнымі матэрыяламі: карэльскім гранітам, парфірам, мармарам.

Да рэволюцыі сельская гаспадарка ў краіне амаль адсутнічала. Балоты, непраходныя лясы і цвёрдыя глебы не паддаваліся апрацоўцы сахой і драўлянай бараной. Свайго хлеба ледзь хапала на тры месяцы ў годзе. «Карэл—кару еў»,—гаварылі аб карэльскіх сялянах, якія сапраўды прымешвалі ў муку сасновую кару.

Цяпер 95 процантаў карэльскіх сялян аб'яднаны ў калгасах. Сотні трактараў апрацоўваюць цяжкую карэльскую зямлю. У краіне ўпершыню з 1933 года закаласілася пшаніца; да гэтага тут сеялі толькі жыта, авёс, ячмень. Рэзка ўзраслі ўраджаі аўсу і бульбы.

Карэлія да рэволюцыі была закінутай і цёмнай ускраінай Расіі. Насельніцтва амаль цалкам было непісьменным. А зараз пісьменнасць насельніцтва дасягае 95 процантаў. У 16 вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах рэспублікі навучаецца 4.400 чалавек. У рэспубліцы выходзіць каля 30 газет на карэльскай мове агульным тыражом больш 15 мільёнаў экземпляраў.

Сталіца Карэла-Фінскай ССР—Петразаводск—размешчана на Онежскім возеры і на вялікай чыгуначнай магістралі (Кіраўская чыгунка), перасякаючай рэспубліку з поўдня на поўнач і злучаючай Ленінград з незамярзаючым портам на Баранцавым моры—Мурманскам. У Петразаводску жыве каля 70 тысяч чалавек. Гэта вялікі горад, які за апошнія годы ўпарадкаваўся і адбудоўваецца. Другія вялікія гарады рэспублікі: Выбарг—буйны порт на Балтыйскім моры, Кексгольм—на Ладажскім возеры і Беламорск — порт на Белым моры, дзе якога пачынаецца грандыёзны штучны водны шлях—Беламорска-Балтыйскі канал імені Сталіна, які злучае Белае мора з Балтыйскім.